ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

***LITERARY SCIENCE***

УДК 821.161.3.09-145
http://doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-1-85-91

**А. А. Бараноўскі**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# СПЕЦЫФІКА МАСТАЦКАГА ПАЗНАННЯ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ФІЛАСОФСКАЙ ЛІРЫЦЫ

**Аннотация.** Исследованы произведения белорусских поэтов В. Зуенка, Н. Метлицкого, А. Рязанова. В лирических текстах авторы предлагают индивидуально-авторские интерпретации картины мира, акцентируют внимание на «вечных» проблемах, посредством художественного выражения познают себя и мир. Кроме того, в исследовании косвенно отражена творческая эволюция поэтов, что дает возможность подчеркнуть некоторые векторы развития «поэзии мысли» и проследить за формированием авторского мировоззрения.

**Ключевые слова:** гносеология, познание, философская лирика, духовные и материальные ценности

**Для цитирования:** Бараноўскі, А. А. Спецыфіка мастацкага пазнання ў сучаснай беларускай філасофскай лірыцы / А. А. Бараноўскі // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2020. – Т. 65, № 1. – С. 85–91. http://doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-1-85-91

**Aliaksandr A. Baranouski**

*Center for Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## SPECIFICITY OF ARTISTIC KNOWLEDGE IN MODERN BELARUSIAN PHILOSOPHICAL LYRICS

**Abstract.** The original works of Belarusian poets V. Zuyonak, M. Myatlicky, A. Razanau are examined in the article. Authors show individual author's interpretations of the world picture, focus on the "eternal" problems in the lyrical texts. Moreover, the article reflects indirectly the creative evolution of poets, it makes possible to emphasize the main vectors of the development of "poetry of thought", and to follow the formation of the author's worldview.

**Keywords:** epistemology, knowledge, philosophical lyrics, spiritual and material values

**For citation:** Baranouski A. A. Specificity of artistic knowledge in modern Belarusian philosophical lyrics. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryya humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2020, vol. 65, no. 1, pp. 85–91 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2020-65-1-85-91

Гнасеалогія – раздзел філасофіі, у якім вызначаюцца передумовы пазнання, даследуюцца яго магчымасці, выяўляецца ступень яго дакладнасці. Тэорыя пазнання даследуе ўмовы, механізмы, прынцыпы, формы і метады пазнавальнай дзейнасці чалавека.

І хоць тэрмін «гнасеалогія» ўведзены ў філасофію параўнальна нядаўна (у 1854 г. шатландскім філосафам Дж. Фэрэра), само вучэнне аб пазнанні і пазнавальных здольнасцях чалавека бярэ пачатак у старажытнагрэчаскай філасофіі (Геракліт, Парменід, Зянон, Платон, Арыстоцель і інш.).

Тэорыя гнасеалогіі сфарміравалася не адразу, прасачыць яе выразныя абрысы можна ў антычнай філасофіі. Тады з'явіліся формы і віды пазнання (эмпірычныя і тэарэтычныя), быў праведзены аналіз доказнасці ведаў. У Сярэднія вякі пад уплывам рэлігіі гнасеалогія стала супрацьпастаўляць разумовыя здольнасці духоўным адкрыццям. А ў Новы час афармілася ў самастойны раздзел філасофіі. Чалавек пачынае пераасэнсоўваць сваё месца ў свеце, перастае быць цацкай у руках вышэйшых сіл, набывае сваю волю і адказнасць.

© Бараноўскі А. А., 2020

Паступова афармляецца так званы **пазнавальны вобраз** – ідэальнае ўспрыманне аб'ектаў, якое адлюстроўвае адносіны іх падабенства. Для розных пазнавальных вобразаў згаданае падабенства неаднолькавае [1]:

– вобразы, якія ўзнікаюць пры непасрэдным узаемадзеянні суб'екта і аб'екта, уваходзяць у сістэму **пачуццёвых вобразаў**;

– вобразы апасродкаванага ўзаемадзеяння належаць да сістэмы **рацыянальных вобразаў**.

Сваё адлюстраванне тэорыя пазнання знайшла і ў творчасці сучасных паэтаў філасофскага кірунку. Як слушна заўважыла І. Шаўлякова, «паэтыка свету непазбежна адлюстроўваецца ў паэтыцы тэксту, дзе рэпрэзентуецца пэўны вобраз рэчаіснасці» [2, с. 177]. Сярод самых распаўсюджаных пытанняў тут – праблема сувязі асобы і прыроды і славутае nosce te ipsum. Праўда, шлях да асабістага пазнання нярэдка вядзе праз засваенне агульначалавечага вопыту.

Імкненне спазнаць мікра- і макракосмас у лірыцы Васіля Зуёнка рэалізуецца праз усведамленне значнасці кожнага імгнення, праз успрыманне мовы як сакральнага пачатку. Лірычны герой творцы – «апошні магіканін, ахвярнік прашчурскіх бароў» [3, с. 18] верыць, што «Усё размерана на свеце: / Радзіны і хаўтурны звон» [3, с. 21] ды «Не падуладна толькі слова / Халоднай пэўнасці акоў» [3, с. 21]. Слова тым мацнейшае, паводле меркавання паэта, чым глыбейшая ў ім закладзена думка. У іншым выпадку нават слова можа быць «плоскім», а чалавек без роднай мовы пустым.

Словамі свайго лірычнага героя паэт канстатуе мізэрнасць матэрыяльнага, ён верыць, что думка, пачуццё, душа не паміраюць: «Сплывае гук, а думка застаецца – / як дрэва ў шалясценні залатым» [3, с. 25]. І хоць суб'ект лірычных твораў В. Зуёнка – чалавек сталы і мудры, ён не прыпыняе здзіўляцца, бо «Здзіўленне – подых абнаўлення, / Пункціры – абяцанне адкрыцця…» [3, с. 30].

Ды як бы чалавек не цешыў свой унутраны гонар, якіх вышынь не дасягаў бы, лірычны герой задаецца пытаннем:

На скрыжаваннях сусвету
Хто мы і колькі нас?
Пылінка. Малая пры гэтым.
Драбок галактычных мас [3, с. 40].

«Быційныя» пытанні ўзнімаюцца В. Зуёнкам ва ўсіх яго кнігах. Дзякуючы багатай метафорыцы, аўтар ператварае будзённае ў незвычайнае, малое ў вялікае, заглыбляецца ў сапраўдныя чалавечыя адносіны, спазнае сябе і свет. Вершам В. Зуёнка ўласцівы ўнутраны драматызм і непадробнасць перадачы эмоцый. Гэтая рыса характэрна для ўсіх відаў лірыкі творцы (філасофскай, інтымнай, грамадзянскай, пейзажнай) на кожным з этапаў яе мастацкага росквіту: і ў 1960–1980-я гг. (зб. «Крэсіва», «Крутаяр», «Сяліба», «Нача», «Маўчанне травы», «Світальныя птушкі» і інш.), і ў пачатку 2000-х гг. (зб. «Азірнуўшыся не скамянець...»). У апошніх зборніках творца ўсё часцей адыходзіць ад прыватных бытавых фактаў ці выпадкаў у бок агульначалавечых праблем. Узважыўшы досвед мінулага, лірычны герой класіка беларускай літаратуры заўважае:

І ўсё бліжэй, і ўсё бліжэй
За мною коціцца мой рогат:
«Багоў заўжды на свеце многа,
Бо чалавекам быць – цяжэй» [3, с. 36].

Творчасць В. Зуёнка 2000-х гг. адзначылася мастацкім і філасофскім пераасэнсаваннем катэгорыі часу. Падсумоўваючы жыццёвы вопыт, творца апелюе да «вечных» пытанняў, непазбежна звяртаючыся да паняцця хранатопу. Як слушна зазначыла Наталля Заяц, «прасторава-часавы кантынуум у паэзіі В. Зуёнка адмысловы: лірычнаму герою побач з моцнай эмацыянальнай прыхільнасцю да мясцін маленства ўласціва глабальнае самаадчуванне сябе як часцінкі сусвету. Таму прасторавыя маркеры не зводзяцца толькі да зямной тапанімікі, а пашыраюцца за кошт касмічнай сферы» [4, с. 135]. Пацвярджэнне згаданага тэзіса знаходзім у вершах «Касмічная вестка», «Вогнішча. Месяц. Вечар…», «Небу» і інш.

Разважаючы над уласным прызначэннем на зямлі, лірычны герой В. Зуёнка звяртаецца да Бога («Я знаю: малітва такая ёсць», «Не бойся жыцця: гэта выява Бога», «О Божа, злітуйся над

тымі…», «Божа мой, які ты літасцівы» і інш.). Тэма веры ў філасофскай лірыцы паэта непарыўна звязана з дуальнай апазіцыяй «жыццё–смерць». Наяўнасць апошняй найбольш характэрна для позняга перыяду творчасці мастака слова:

Жывеш – як часу даннік,
Надзея і працяг,
Нясеш цану пазнання
І смерці, і жыцця [3, с. 39].

Цікава, што В. Зуёнак амаль не выкарыстоўвае ў вітальна-танатычных вершах кампазіцыйны прыём супрацьпастаўлення: жыццё, паводле меркавання аўтара, не канфліктуе са смерцю, а сутнасць – з адсутнасцю:

Да кропелькі час адважыцца,
І ў сэрцы астыне біццё.
«Няма бяссмерця», – вы скажаце…
А што ж тады ёсць жыццё? [3, с. 39].

Працяг думкі знаходзім і ў іншым вершы:

Як у скарбонку медзякі,
Як у ляток пражэрнасць трутня,
Як вадкасць тлумная ў глякі, –
Цячэ – і сутнасць, і адсутнасць!.. [3, с. 35].

Адзін з мацнейшых вобразаў В. Зуёнка – вобраз агню. Прыродная стыхія аднaчасова сімвалізуе і жыццё, і смерць. «З прыродаю бязмежнай і адвечнай» лірычны герой адчувае «крэўнасць» праз агонь:

Агонь стварае і агонь руйнуе.
У кропельцы малой – стыхія спіць.
Пытае розум: быць альбо не быць? –
А над усім – адзін агонь пануе [3, с. 47].

Шматзначнаць згаданага сімвала можна інтэрпрэтаваць па-рознаму (як знішчальны і як ачышчальны пачатак), але відавочна адно: лірычнага героя не палохае прыродная стыхія, яна выклікае ў яго захапленне.

Адметную рэалізацыю індуктыўнага і дэдуктыўнага метадаў спазнання рэчаіснасці прапануе Мікола Мятліцкі: агульнае ў яго лірыцы нярэдка становіцца прадметам уласных разважанняў, прыватнае дазваляе спасцігнуць агульначалавечы досвед:

Паміж бяроз, дзе прадзедаў крыжы,
Ці размінёмся з найпакутным векам?
Сыходзяць ядры…
І на іх мяжы
Яшчэ цяжэй застацца чалавекам [5, с. 5].

Лірычнага героя М. Мятліцкага палохае «ядзерны нябыт» Радзімы, які «На шалі веку <…> паклаў свае ў пагрозе мегатроны» [5, с. 4], але, даводзіць паэт, у хуткаплынным зменлівым часе нялёгка захаваць маральнае чалавечае аблічча.

Лірычны герой, як і сам М. Мятліцкі, сталее. «Хлапчук-маўчун з гуллівымі вачыма» [2, с. 84], характэрны для ранняй лірыкі творцы («Абеліск у жыце», «Мой дзень зямны», «Ружа вятроў», «Горкі вырай» і інш.), пакрысе саступіў месца даросламу чалавеку позняга перыяду творчасці («На беразе маім», «Цяпло бусьлінага крыла», «Чалавек падымае неба», «Мой боль вырастае да зор» і інш.), які стала глядзіць на свет і на жыццё: ён пахаваў бацькоў, зведаў цану перасялення, паспытаў на смак горыч расчаравання і асалоду захаплення, ён ведае, што такое падзенне і ўзлёт. Лірычны герой М. Мятліцкага адчувае моцную сувязь з Радзімай, з яе гісторыяй – мінулай, сучаснай, будучай. У разуменні гэтай сувязі паступова адбываецца працэс самапазнання лірычнага героя:

Колькі светаў было
пад нашым Сонцам, і яны,
змеценыя хваляй часу,
успамінаюцца мной…
Бяру адзін з іх – першабытна-дзікунскі,
і ўжо, з вярэдлівым жалем, дзіўлюся патугам
закутага ў скуру прародзіча і думаю:
няўжо гэта ў нечым і я [5, с. 46].

Калі філасофскі пафас верша шчыльна судакранаецца з грамадзянскім, голас аўтарскага «Я» амаль ніколі не гучыць асобнай партыяй. Праз уласнае перажыванне творца рэтранслюе народны (нацыянальны ці агульначалавечы) досвед, па-мастацку агаляючы пры гэтым яго самыя балючыя грані.

У агульнафіласофскіх і аўтабіяграфічных творах лірычны герой М. Мятліцкага ўзнімае шэраг пытанняў адносна ўласнай самаідэнтыфікацыі, але нярэдка згаданыя пытанні застаюцца рытарычнымі:

Хто я? – Вечны сузіральнік
Недасяжнай небнай шыры.
Нада мною, як пытальнік,
Млечны Шлях…
І зор пункціры [5, с. 47].

Гнасеалагічны пачатак упісваецца паэтам у кантэкст пошуку адзінства паміж знешнім і ўнутраным, паміж часовым і вечным, паміж «сёння» і «назаўжды». Урэшце, паэт прыходзіць да высновы, што чалавечае жыццё – гэта імгненне:

Усё ў імгненні ёсць!
Яно ўладарна, вечнае, ўзышло
Ў абсяжных межах гэтае планеты.
Сышліся ў ім ўсяго жыцця прыкметы,
Крыжуе шаблі ў ім Дабро і Зло.
<…>
Ляціць суветаў чорнае сяво…
Імгненне толькі…
Смерць і нараджэнне [5, с. 57].

Той жа матыў назіраем у іншым вершы М. Мятліцкага «Зямля»:

Зямля,
трымаючы нас
на скарынцы грунту,
<…>
гаворыць:
часовае ваша быццё! [5, с. 326].

Уласны скон не палохае лірычнага героя. Элегічны настрой некаторых вершаў М. Мятліцкага звязаны галоўным чынам са стратай родных яму людзей, з заняпадам вёскі, у якой прайшло маленства.

Лепшыя вершы мастака слова нараджаюцца на піку эмацыянальнага перажывання. Крыніцай творчага натхнення пры гэтым можа быць усе, што хочаш, – ад палёту чалавека ў космас да ўсмешкі дзіцяці. Па словах літаратуразнаўцы В. Заманскай, «экзістэнцыяльная свядомасць, якая адкрыла чалавеку трагедыю яго існавання ў свеце, – неабходны атрыбут мастацкай літаратуры» [6, с. 23]. Узорныя вершы М. Мятліцкага характарызуюцца ўзвышанасцю пафасу, палётнасцю думкі і гранічнай шчырасцю з чытачом.

І калі сацыяльна-грамадзянскае сталенне паэта адбывалася праз спасціжэнне нацыянальнага вопыту (асэнсаванне ваенных і пасляваенных гадоў, перажыванне Чарнобыльскай трагедыі і інш.), то фарміраванню духоўнага стрыжня, мяркуючы па вершах, М. Мятліцкі абавязаны сваёй маці. Менавіта ёй паэт прысвяціў шэраг лірычных твораў: «Матчына хата», «– Мама!..», «Мама, якое высокае жыта», «Радаўніца», «Матчына просьба», «Бяссмерце» і інш.:

Мая душа не выстыла, павер,
Не вее стыла чэзласцю пустыні.
Рыпіць над студняй раніцай асвер,
І рукі я цягну праз далячыні.
<…>
Світае ранне… Мама па ваду
На двор сышла, прадзьмуты скразнякамі.
Ці бачыш, мама, – побач я іду,
Трымаю дужкі дужымі рукамі [5, с. 17].

Калі лірычны герой М. Мятліцкага разважае над лёсам зямлі, над спрадвечнымі праблемамі чалавецтва, ён паўстае перад чытачом як сапраўдны мудрэц-філосаф з вялікім жыццёвым вопытам і тонкай інтуіцыяй. Згадваючы матулю, родны Бабчын, сяброў маленства, М. Мятліцкі, як і герой яго твораў, зноў становіцца хлапчуком, якому не стае бацькоўскай пяшчоты, цеплыні, любові:

…Я сіратой пад небам стаю.
Чорнае неба цэдзіць
З сухмарка на магілу тваю
Стронцый і цэзій.
Мама, ішоў я з-пад крыл бяды
Вёскаю скутай, нямой.
Леглі шырока твае клады.
Паразмаўляй са мной [5, с. 119].

Сваё духоўнае адраджэнне паэт звязвае з пачуццём любові да Радзімы і сям'і.

Гнасеалагічныя матывы ў лірыцы іншага паэта-інтэлектуала – Алеся Разанава – прадстаўлены праз спасціжэнне ісціны як асноваўтваральнага пачатку ўсяго існага:

Спазнаць –
спазнаеш разважанні,
трактаты, дні, календары,
спазнаеш круг і скрыжаванне,
спіраль…
А ісціну – ствары [7, с. 10].

Аўтар усведамляе ісціну як індывідуальную праяву кожнага чалавека. Але тое, што бачыцца сапраўдным для аднаго, можа быць падманам для другога:

Шукаем ісціну.
Сцюдзёна
яна ў азоне і ў вадзе…
Яе не знае здавалёны,
яна сасмяглага вядзе [7, с. 9].

Цікава, што ў кожным новым паэтычным зборніку імкненне А. Разанава спасцігнуць таямніцы рэчыўнага свету толькі ўзмацняюцца. І калі В. Зуёнак і М. Мятліцкі ў сваёй творчасці ідуць ад духоўнага парыву (праз унутранае перажыванне імкнуцца спасцігнуць законы светаўладкавання), то А. Разанаў бачыць свет матэматычна – праз знакі, сімвалы, формулы. Так, у прадмове да кнігі пункціраў «Такая і гэтакі: талакуе з маланкай гром» (2018) творца зазначыў: «Пункціры – акупункціры: у іх свая паэтыка, свае стасункі з рэчаіснасцю. Сціслыя, як формулы, і красамоўныя, як малюнкі, яны ў звычайным распазнаюць істотнае і адрасуюцца ўсім і кожнаму» [7]. Называючы тую ці іншую рэч, паэт выклікае ў чытача не прамое ўяўленне пра саму рэч, а шэраг асацыяцый, якія з ёй звязаны.

Пры ўсёй сэнсавай глыбіні разанаўскіх паэтычных форм пункціры з'яўляюцца найбольш хаатычным адлюстраваннем рэчаіснасці, яны, так сказаць, уяўляюць сабой замалёўкі з натуры, адбываюцца тут і цяпер, бо праз хвіліну рызыкуюць стаць неактуальнымі: «Сохнуць на плоце збанкі» [7, с. 65], «Снег усцілае зямлю» [7, с. 69], «Змяркаецца» [7, с. 70], «Вагаюцца цені ля вогнішча» [7, с. 83] і інш.

Лірычны герой у пунктірах – асоба не дзеючая, ён з’яўляецца пасіўным сузіральнікам, максімальна набліжаным да аўтарскага «Я», праз зрок, слых і вопыт якога чытач успрымае галоўны пасыл твора. Так, у адным з разанаўскіх наватвораў, спасцігаючы сэнс жыцця, лірычны суб’ект прыходзіць да разумення:

Блакіт нябёсаў,
луг стракаты
больш не узрадуюць таго,
хто страціў сэнс.
Бо сэнсу страта –
то, пэўна, страта усяго [7, с. 13].

Гнасеалагічнае мысленне А. Разанава грунтуецца на эмпірычных метадах назірання і параўнання. Лірычны герой у такіх вершах – самотнік-інтраверт, здольны да аналізу і глыбокіх інтэлектуальных высноў: «Нібы святочная ёлка, / ззяе вокнамі новы дом: / ці за кожным радасць?» [4, с. 47], «Стаіўся за дрэвам – / і для паловы свету / стаў толькі дрэвам» [7, с. 52].

Лірык балансуе паміж аб’ектыўнымі ацэнкамі і суб’ектыўнымі асацыяцыямі. З аднаго боку, чытач павінен атрымаць магчымасць спасцігнуць чужыя адчуванні ўласным вопытам (інфармацыйны пасыл павінен быць зразумелы), з другога – прадмет адлюстравання ў лірыцы А. Разанава з’яўляецца індывідуальным аўтарскім перажываннем.

Я – рака.
Цяку ад таго,
Дзе быў,
Кім стаў…
А яно даганяе мяне берагамі [7, с. 27].

Заглыбленне А. Разанава ў метафізічную прыроду рэчаў пашырае прастору ілюзій і сэнсаў у яго творах. У фокусе разанаўскага спасціжэння свету – тэмы не толькі індывідуальнага характару, але і агульнабыційнага. Так, адмысловым чынам раскрыта паэтам тэма жыцця і смерці:

Прадвесніца:
дрэвы
ўслухоўваюцца ў вестку,
пні – у немату [7, с. 90].

У лірыцы А. Разанава па-асабліваму арганізаваны час і прастора: у мастацкім тэксце адлюстроўваецца не рэальнасць, а яе ўспрыманне лірычным героем. Псіхалагізацыя прасторава-часавага кантынууму наглядна праяўляецца ў лірыцы ў выглядзе змешвання розных храналагічных і тапаграфічных планаў. Як і ў іншых лірычных формах А. Разанава (квантэмах, вершаказах, зномах, злесах), лірычны герой не ўспрымае навакольную прастору адзіна магчымай. Разанаўская тэорыя шматсветнасці грунтуецца на рэалізацыі матыву сну/снабачання («Блукаюць сны у лабірынце роздуму, / і ў снах блукае роздум – шлях людскі» [7, с. 15]), а таксама праз выкарыстанне вобраза люстэрка і яго аналагаў (студні, вітрыны, акна і інш.): «Блукаю сцямнелымі вуліцамі: / з вітрын / шлядзяць узорныя людзі» [7, с. 102], «Ходнік – люстэрка: / у неба ўваходзіць дождж» [7, с. 232].

Пры ўсёй знешняй халоднасці і эмацыянальнай суцішанасці лірычны герой А. Разанава не пазбаўлены пазітыўнага мыслення: «Цямнее: пара запальваць ліхтара / Цяжэе: пара ўсміхацца» [7, с. 109].

Такім тынам, як і ў ХХ стагоддзі, у пачатку ХХІ стагоддзя пытаннем першараднай важнасці для мастацтва і навукі становіцца пазнавальнасць свету. Гнасеалогія канцэнтруецца на праблеме несупадзення свету ўяўнага (народжанага свядомасцю) і свету рэальнага (аб’ектыўна існуючага).

Так, В. Зуёнак, спрабуючы спазнаць сябе і свет, а таксама сябе ў свеце, імкнецца ўсебакова ахапіць рэчаіснасць, арыентуючыся на ўласную аксіялагічную базу і на гістарычны вопыт народа. Аўтар пашырае сацыяльна-гістарычныя і духоўныя далягляды. Яго лірыка канцэнтруе ў сабе і глыбокую філасофскую праблематыку, і нацыяльны досвед. Гнасеалагічныя матывы мастака слова грунтуюцца галоўным чынам на пачуццёвых вобразах веры і бязвер’я, закранаюць праблему

прызначэння чалавека на зямлі. Асаблівую ўвагу аўтар надае захаванню культурных каштоўнасцей, у прыватнасці, мовы, без якой нацыянальная і чалавечая самаідэнтыфікацыя немагчыма.

Класічнай традыцыі пры рэалізацыі гнасеалагічных матываў прытрымліваецца і М. Мятліцкі. Лёс яго лірычнага героя цесна знітаваны з пакутным лёсам малой радзімы. Паэт не проста фіксуе гістарычныя рэаліі, ён імкнецца іх зразумець.

Іншым шляхам, у адрозненне ад папярэдніх аўтараў, пайшоў А. Разанаў. У малых лірычных формах-замалёўках творца адлюстроўвае той ці іншы момант рэчаіснасці і адначасова ўскосна перадае адносіны лірычнага героя да прадмета развяг. Спазнанне свету лірычным героем адбываецца мазаічна – праз спасціжэнне яе ключавых момантаў.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Аскольдов, С. А. Гносеология : статьи / С. А. Аскольдов. – М. : Изд-во Моск. Патриархии Рус. Православ. Церкви, 2012. – 198 с.

2. Шаўлякова, І. Наш універсум. Вопыт сімвалічнай інтэрпрэтацыі сучаснай беларускай літаратуры / І. Шаўлякова // Полымя. – 1999. – № 6. – С. 186–189.

3. Зуёнак, В. Азірнуўшыся, не скамянець…: вершы, фрагменты з паэм / В. Зуёнак. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 270 с.

4. Заяц, Н. Часавыя вымярэнні паэзіі Васіля Зуёнка : (на матэрыяле пакуль не выдадзеных кніг) / Н. Заяц // Маладосць. – 2016. – № 3. – С. 135–137.

5. Мятліцкі, М. Чалавек падымае неба / М. Мятліцкі. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2012. – 360 с.

6. Заманская, В. В. Экзистенциальная традиция в русской литературе XX века. Диалоги на границах столетий : учеб. пособие / В. В. Заманская. – М. : Флинта, 2002. – 302 с.

7. Разанаў, А. Такая і гэтакі: талакуе з маланкай дождж : пункціры / А. Разанаў. – Мінск : Маст. літ., 2018. – 278 с.

## References

1. Askol'dov S. A. *Gnoseology: articles*. Moscow, Publishing house of the Moscow Patriarchate of the Russian Orthodox Church, 2012. 198 p. (in Russian).

2. Shaulyakova I. Our Universe. The experience of symbolic interpretation of modern Belarusian literature. *Polymya* [Flame], 1999, no. 6, pp. 186–189 (in Belarusian).

3. Zuenak V. *Looking back, do not turn to stone...: poetry, excerpts from poems*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 2013. 270 p. (in Belarusian).

4. Zayats N. Timing measurements poetry Vasil Zuyenok: (on the material until published books). *Maladosts'* [Early], 2016, no. 3, pp. 135–137 (in Belarusian).

5. Myatlitski M. *A man raises the sky*. Minsk, Chatyry chvertsi Publ., 2012. 360 p. (in Belarusian).

6. Zamanskaya V. V. *Existential tradition in Russian literature of the 20th century. Dialogues on the borders of centuries*. Moscow, Flinta Publ., 2002. 302 p. (in Russian).

7. Razanau A. *Such and such: speaks with lightning a rain: points*. Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 2018. 278 p. (in Belarusian).

## Информация об авторе

**Барановский Александр Александрович** – кандидат филологических наук, старший научный сотрудник. Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы, Национальная академия наук Беларуси (ул. Сурганова, 1, корп. 2, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: lisorre@yandex.ru

## Information about the author

**Aliaksandr A. Baranouski** – Ph. D (Philol.), Senior Researcher. Center for Belarusian Culture, Language and Literature researches of the National Academy of Sciences of Belarus (1 Surganov Str., Bldg 2, 220072 Minsk, Belarus). E-mail: lisorre@yandex.ru